ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

# Хрэстаматыя па літаратурным чытанні 2 клас

*Дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання*

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Сэр-Віт»
2022

# Колеры года. Восень



*Прырода – гэта жывая мова, займальная, поўная таямніц і загадак. Прыслухоўвайся і пазнавай яе.*

*Ніна Галіноўская*

## На прагулцы

Нібы церам, жоўты скверык.
Гэй ты, церам-церамок,
Адчыні свае нам дзверы,
Адамкні хутчэй замок!
Ціха шчоўкнуў лісцік-ключык –
Пад нагамі – дыванок,
Жоўты, пышны і пявучы.
– Чый ты, церам-церамок?
– Мой. Заходзьце, – кажа восень, –
Вельмі рада я гасцям.
Вецер казкі мне прыносіць.
Раскажу іх, дзеці, вам.



*Міхась Даніленка*

# Восень шыла сарафан

Задумала Восень сабе абнову пашыць… І перш за ўсё выбрала залацістыя і чырванаватыя колеры: яны ёй больш да твару. Ціха хадзіла палямі, пералескамі і падбірала сабе на сарафан то трохі чырвані, то залацінак, што свяціліся ў лістоце дрэў. І асіны, і грушы аж чырванелі ў праменнях ціхага сонца, а клёны і бярозы залаціліся сваімі кронамі на ўзлессі.

«Добра было б па́церкі* падабраць», – падумала Восень і ўбачыла рабіну. Гронкі яе наліліся чырванню, цяжка звісалі долу. Чым не пацеркі?

А потым Восень яшчэ збірала дробненькія сінюткія кветачкі верасу, сціплых бяссмертнікаў. А ў сваю касу ўпляла трапяткія белыя павуцінкі…

– Цяпер, здаецца, усё, – сказала Восень і паглядзела ў круглае люстэрка – шырокае азярцо.

---

* **Па́церкі** – упрыгажэнне, якое жанчыны носяць на шыі.

*Авяр'ян Дзеружынскі*

# Хто вас у школу сабіраў?

Настаўнік першакласнікаў
Спытаў:
– Хто ў школу вас,
Скажыце, сабіраў?
Пачуў адказы
Хутка ён тады:
– Ды мамы, таты,
Бабкі і дзяды.
– Так ды не так! –
І падказаць рашыў:
– Хто формы школьныя
Для вас пашыў?
Хто вам паперы добрай
Многа даў?
Хто напісаў вам
Шмат цікавых кніг?
У школу хто вас,
Дзеці, сабіраў,
Вы можаце
Назваць усіх?

*Яніна Жабко*

# Залатая казка

Нам гасцінна дзверы
Восень адчыняе.
У залатую казку
Ве́тла* запрашае.

У садах наўкола
Яблыкі паспелі.
Пацеркі каліны
Зноў зачырванелі.

У вярбы над рэчкай
Залацяцца косы.
І гараць на травах
Восеньскія росы.

Шые восень казку
Срэбнай павуцінкай.
Мы ідзём у казку
Залатой сцяжынкай.

* **Ве́тла** – тое, што і ветліва.

*Яніна Жабко*

# Восень вераснёвая

Хораша прыбралася
Восень вераснёвая.
У бярозкі-модніцы
Сукеначка новая.

Тонкія рабіначкі
Пад ветрам схіляюцца,
Ягадныя гроначкі
Сокам наліваюцца.

Макавінка клёна
Чырвона-барво́вая*...
Так вось апранаецца
Восень вераснёвая.



---

* **Барво́вая** – вельмі чырвоная.

*Васіль Жуковіч*

# Маладая восень

Залатыя стужкі
на бярозцы мілай.
Хутка, хутка птушкі
паляцяць у вырай.
І вятры крутыя
гучна загамоняць,
воблакі густыя
неба запалоняць.
А пакуль што – про́сінь*
між аблокаў белых.
Маладая восень
толькі прыляцела.



* **Про́сінь** – сіняе адценне ў афарбоўцы чаго-небудзь.

# Змест

## Колеры года. Восень

*Ніна Галіноўская*
На прагулцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
*Міхась Даніленка*
Восень шыла сарафан. . . . . . . . . . . . . . . 6
*Авяр’ян Дзержынскі*
Хто вас у школу сабіраў? . . . . . . . . . . . 7
*Яніна Жабко*
Залатая казка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
*Яніна Жабко*
Восень вераснёвая . . . . . . . . . . . . . . . 9
*Васіль Жуковіч*
Маладая восень . . . . . . . . . . . . . . . . 10
*Клаўдзія Каліна*
Верасень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
*Галіна Каржанеўская*
Песенька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
*Міхась Пазнякоў*
Першага верасня . . . . . . . . . . . . . . . 13
*Сяргей Панізнік*
Верасень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14

## Маёй Радзімы дзіўны свет

*Расціслаў Бензярук*
Шпак і Верабей. . . . . . . . . . . . . . . . . 17
*Ніна Галіноўская*
Журка-журавель . . . . . . . . . . . . . . . 19

*Авяр'ян Дзеружынскі*
Васілёк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
*Авяр'ян Дзеружынскі*
Прыляцеў я ў свой край . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
*Васіль Жуковіч*
Жураўліны вырай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
*Васіль Жуковіч*
Незаменнае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
*Міхась Калачынскі*
Размова з жураўлём . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
*Уладзімір Ліпскі*
Салдацкае пісьмо . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
*Міхась Пазнякоў*
Міколкавы пытанні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
*Міхась Пазнякоў*
Скарб. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
*Міхась Пазнякоў*
Родная мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

**Жывая кніга беларускай прыроды**

*Янка Галубовіч*
Галкі грэюцца. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
*Міхась Даніленка*
Абляпіха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
*Уладзімір Мазго*
Птушыная сталоўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
*Алесь Марціновіч*
Верабейка Чыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39

*Іван Муравейка*
Для чаго снягір каляровы? . . . . . . . . . . . . . . . . 42

## Колеры года. Зіма

*Кастусь Жук*
Беларуская зіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
*Казімір Камейша*
Першы снег . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
*Юрась Свірка*
З першым снегам! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
*Васіль Жуковіч*
Снежная баба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
*Янка Галубовіч*
Андрэйка-памочнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
*Міхась Даніленка*
Як Петрык мароз напалохаў . . . . . . . . . . . . . . 53
*Валянцін Лукша*
За што люблю я Новы год? . . . . . . . . . . . . . . . 56
*Павел Ткачоў*
Пад Новы год . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
*Міхась Пазнякоў*
На горку! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
*Міхась Пазнякоў*
Зімовыя птушкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
*Пятро Прыходзька*
Сінічка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
*Мікола Бусько*
Зіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63

## Сустрэча з казкай

Пшанічны каласок (*казка*). . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Не сілай, а розумам (*казка*) . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Сабака і воўк (*казка*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75

## Урокі жыцця

*Лідзія Арабей*
Зернетка і вецер . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
*Генадзь Аўласенка*
Сказ пра Мураша-лайдака . . . . . . . . . . . . . . . . 90
*Расціслаў Бензярук*
Клекатунчык . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
*Расціслаў Бензярук*
Заяц, вожык і ручай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
*Расціслаў Бензярук*
Чыя моркаўка? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
*Ядвіга Бяганская*
Сябры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
*Ніна Галіноўская*
Ветлівы свавольнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
*Ніна Галіноўская*
Няўважлівыя лісяняты . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
*Ніна Галіноўская*
Выратаваў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
*Васіль Жуковіч*
Не ўмею, паспею... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
*Васіль Жуковіч*
Хто вінаваты? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108

*Рыгор Ігнаценка*
Наш мосцік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
*Уладзімір Карызна*
Чыстая градка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .111
*Марыя Лук*
Выпадак з марожаным. . . . . . . . . . . . . . .113
*Міхась Даніленка*
Заяц Доўгае Вуха . . . . . . . . . . . . . . . . . .114
*Міхась Даніленка*
Салодкая цыбуля . . . . . . . . . . . . . . . . . .116
*Авяр'ян Дзеружынскі*
Памочніца. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .117
*Клаўдзія Каліна*
Хлопчык Пакідайчык . . . . . . . . . . . . . . .119
*Іван Муравейка*
Ціма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
*Іван Муравейка*
Тры лыжкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
*Міхась Пазнякоў*
Хлеб . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
*Сяргей Панізнік*
Чарадзейныя словы . . . . . . . . . . . . . . . 128
*Нічыпар Парукаў*
Не хапіла работы . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
*Яраслаў Пархута*
Кропелька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .131
*Паўлюк Прануза*
На градцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134

*Васіль Ткачоў*
Гузак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136

**Клопат пра тых, хто навокал**

*Алесь Ставер*
Матылёк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .141
*Юрась Свірка*
Ласіны стажок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .142
*Юрась Свірка*
Сняжок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .143
*Павел Кавалёў*
Жыві сабе, зайчык! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
*Яраслаў Пархута*
Снегавічок. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 150
*Павел Ткачоў*
Шэрая курачка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .152
*Павел Ткачоў*
Ласяня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155
*Мікола Янчанка*
Бярозка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 158

**Колеры года. Вясна**

*Генадзь Аўласенка*
Ганарлівая кветачка. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 163
*Ядвіга Бяганская*
Дзе начавалі рукавічкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 166
*Ніна Галіноўская*
Вясновая бярозка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .170

*Янка Галубовіч*
Вожык і ручаёк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17ё
*Янка Журба*
Пчолка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
*Ала Кажэра*
Сінютка-Анютка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 173
*Тадзіяна Кляшторная*
Шпак. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177
*Мікола Маляўка*
Каб вясна хутчэй настала . . . . . . . . . . . . . . . 177
*Паўлюк Прануза*
Я вясну малюю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
*Павел Саковіч*
Коцікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 180

**Сям'я – прытулак дабрыні**

*Расціслаў Бензярук*
Малінавы чай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
*Вера Вярба*
Матуліны рукі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
*Ніна Галіноўская*
Бабуліна песня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 187
*Ніна Галіноўская*
Камп'ютаршчык. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
*Ніна Галіноўская*
Песня для мамы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
*Яніна Жабко*
Самы любы мой дзянёк... . . . . . . . . . . . . . . . 190

*Васіль Жуковіч*
Свая дапамога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 191
*Клаўдзія Каліна*
Кампот . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
*Уладзімір Ліпскі*
Цацкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
*Іван Муравейка*
Адно яечка на дваіх . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
*Алесь Пісьмянкоў*
Бабчыны дранікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 199
*Паўлюк Прануза*
Маміны рукі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 200
*Пятро Сушко*
Зязюля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 201
*Васіль Ткачоў*
Незвычайны дыктант . . . . . . . . . . . . . . . . 201
*Васіль Хомчанка*
Апельсін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203
*Васіль Хомчанка*
Мама . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204

**Выкарыстаная літаратура** . . . . . . . . . . . . . . 207